7. *Леановіч І. А.* Жыллё рабочых г. Мінска ў даваенны перыяд (1917–1941гг.).// Весці Акадэміі Навук Беларускай ССР № 1. 1974. Серыя грамацкіх навук. С. 104–112.
8. Минск. Краткая хроника:(ноябрь 1917 – 1966).Мн., 1966.
9. Памяць. Мінск у 4–х кнігах. Кніга 3.Мн., 2004.
10. Савецкая Беларусь. – №276 (681) 13 снежня 1922. – № 221 (626) 5 кастрычніка 1922. – №208(1205) 9 верасня 1924 . – №79 (1378) 8 красавіка 1925 . – №81 (1991) 10 красавіка 1925 №133 (1432) 17 чэрвеня 1925.
11. *Шыбека З. В. Шыбека С. Ф.* Мінск.Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада. Мн., 1994.

# ПЫТАННЕ АБ СУТНАСЦІ І АБ'ЁМЕ АДЗІНАЎЛАДДЗЯ ПЕРШАГА РЫМСКАГА ПРЫНЦЭПСА

**А. А. Рагойша**

Рымская дзяржава часоў Аўгуста – гэта добра дакументаваны гістарычны аб'ект, прыдатны для вывучэння працэсу і прычын пераўтварэння краіны з рэспубліканскай формай кіравання ў адзінаўладную манархічную імперыю, працэсу прыходу і станаўлення дыктатуры. Мэтай дадзенай працы з'яўляецца даследаванне таго, як Аўгуст распарадзіўся вышэйшай уладаю ў Рыме, аналіз сутнасці створанай ім палітычнай сістэмы раннерымскай імперыі ў форме прынцыпату і пошук адказу на пытанне, чаму ён змог правесці мноства рэформ, прынятых грамадствам.

Перадумовы змены дзяржаўнага ладу выспявалі і ў палітыцы, і ў эканоміцы, і ў сацыяльнай сферы Рымскай рэспублікі.

Пасля заканчэння саюзнай вайны Рым пераўтварыўся з полісу ў сталіцу Італіі і міжземнаморскай дзяржавы [1]. Полісная структура з яе выбарнымі магістратурамі не магла існаваць у такой вялікай краіне. Выбары маюць сэнс толькі тады, калі ў іх удзельнічае большасць насельніцтва, якое мае права голасу. Пасля атрымання італікамі правоў рымлян народныя сходы былі немагчымыя па аб'ектыўных прычынах. У той час людзі не прыдумалі прадстаўнічых органаў ўлады, такіх як парламент, таму неўдзел усіх жыхароў у працы цантральнай улады паставіў пад пытанне неабходнасць існавання выбарных магістратур.

Крывавыя грамадзянскія войны, дыктатура Марыя, праскрыпцыі Сулы, паўстанне рабоў, першы трыумвірат, другі трыумвірат – усе гэтыя падзеі паказвалі на тое, што, нажаль, Рэспубліка пражыла свой век. Стала неабходным змяніць яе на новую сістэму ўзаемаадносін дзяржавы і народа. Папярэднія дыктатуры праілюстравалі грамадству няправільныя шляхі, і толькі Аўгуст змог стварыць самую жыццястойкую сістэму – быццам сам час праводзіў натуральны адбор.

Што да эканомікі, праблемы канцэнтраваліся ў існаванні поліснаабшчыннай сістэмы, якая не магла забяспечыць рынак таварамі. На

змену дробнаму ішло буйное землеўладанне, малая рамесная майстэрня замянялася на вялікую, дамашняе рабаўладальніцтва выцяснялася буйным з дзесяткамі ці сотнямі рабоў, што працавалі на вілах магнатаў. Рабаўладальнікам былі патрэбны моцная ўлада, стабільнасць, гарантыі ад рабскіх паўстанняў [1]. У манархіі не магло здарыцца, напрыклад, такіх глупстваў, калі Сенат прызначаў дыктатара, дыктатар вёў вайну, і тут раптам яго паўнамоцтвы павінны былі быць складзеныя з-за зыходу тэрміну, незалежна ад таго, ў якой сітуацыі кіраўнік пакідае войска.

Што тычыцца сацыяльнай сферы, то на той момант сфарміраваліся перадумовы перападзелу сродкаў вытворчасці. Ні «новыя людзі», ні тым больш ветэраны не маглі пагадзіцца з эканамічнай манаполіяй набілітэту. Тым больш, пралетарыят заўсёды быў гатовы адабраць і падзяліць.

13 студзеня 27 года да новай эры Актавіян складвае надзвычайныя паўнамоцтвы трыумвіра. У адказ сенат і рымскі народ угаворваюць яго не пакідаць Бацькаўшчыну, Актавіян, канешне, не можа не згадзіцца. З гэтага часу і пачынаюцца рэформы, якія пранізваюць усе сферы жыцця: культурную, палітычную, эканамічную, сацыяльную [2].

Пасля таго як Актавіян разбіў войскі Антонія і той закончыў сваё жыццё самагубствам, Актавіян, застаўшыся адзіным уладаром Рымскай рэспублікі, пачаў рэфармаванне дзяржаўнага апарату. Актавіян не хацеў прымаць які-небудзь адзін тытул. Тытул дыктатара быў скампраментаваны падчас дыктатуры Сулы; эліністычны «басілеўс» і старажытарымскі «рэкс» былі занадта рэзкія для вуха грамадзяніна, які прывык да роўнасці, да рэспублікі. Таму Актавіян пайшоў па лепшаму шляху збірання традыцыйных магістратур [3].

Сацыяльную палітыку Аўгуста можна размеркаваць на тры плыні [3].

Па-першае, ішло ўзмацненне і паглыбленне рабаўладальніцкіх адносінаў, што праявілася ў выданні мноства законаў, якія рэгулявалі адносіны паміж рабамі і іх гаспадарамі, а таксама ў пошуках беглых рабоў і іх вяртанні.

Другім напрамкам палітыкі была кансалідацыя вышэйшага класу. Паміж вышэйшымі саслоўямі існавалі розныя супярэчнасці: сенатары – вершнікі з-за суда і ўвогуле ўплыву; вершнікі – правінцыйная знаць з-за фінансавых аперацый ў правінцыях; набілітэт – плебс з-за няроўнага размеркавання маёмасці. Таму Аўгуст імкнуўся знішчыць ці хоць бы знізіць супярэчнасці дзеля перадухілення сацыяльнага выбуху.

Трэцім важным кірункам было ўзмацненне сярэдняй праслойкі грамадства: мелкіх і сярэдніх рамеснікаў і землеўладальнікаў, – Аўгуст хацеў засяродзіць іх увагу на гаспадарчай дзейнасці, а не на кіруючай.

Гэтаму садзейнічалі заканчэнне войнаў, усталяванне міру, адраджэнне гандлю і ўвогуле эканомікі.

Аўгуст, не будучы таленавітым ваяводаю і ў самым пачатку кар'еры не будучы магутным палітычным дзеячом, змог вывернуць навыварот увесь міжземнаморскі свет. Такое мог зрабіць толькі чалавек з выключнымі талентамі. Канешне, не трэба недаацэньваць, што яго рэформы былі неабходнымі і былі лагічнай заканамернасцю — радыкальны паварот гісторыі немагчыма зрабіць на голым месцы. Усё ж такі Аўгуст даказаў, што менавіта ён зможа правесці такія рэформы, што менавіта ён зможа стаць бацькам нараджаючайся краіны. Кажуць, што Аўгуст быў няздатны, слабы, і пералічваюць астатнія яго недахопы — гэта, на мой погляд, зусім не так. Менавіта ж Аўгуст перамог ворагаў у грамадзянскай вайне, а не яны яго, таму дыскусіі аб слабасці гэтага чалавека выглядаюць зусім неабаснаванымі. Канешне, не трэба забываць, што ішоў Аўгуст па чалавечых касцях, па тысячах загубленых жыццяў – ішоў наперад дзеля таго, каб з цемры грамадзянскіх войн нарадзіўся новы свет. Чамусьці ў выпадку Вялікіх людзей гісторыя амаль заўсёды забывае іх адмоўныя бакі, іх крывавыя рукі. Так было з Аляксандрам, Цэзарам, так здарылася і з Аўгустам. З другога боку, ён знаходзіўся ў вузкім калідоры, у складаных ўмовах яму прыходзілася лавіраваць паміж паваротамі гісторыі. Адзін крок улева, крок управа ад ужо вядомага нам ягонага шляху маглі зусім па-іншаму павярнуць кола сусветных падзей. Тады хто ён — параджэнне гістарычнага лёсу ці чалавек, якому хапіла сілператрэсці свет, як яму захочацца? На мой погляд, і тое, і другое.

Аўгуст улічыў памылкі свайго прыёмнага бацькі. Жорсткая расправа з ворагамі, магчыма, выратавала яму жыццё. Цэзар хацеў кансалідаваць розныя колы грамадства — гэта быў прайгравальны варыянт, бо занадта кантрастных людзей ён імкнуўся памірыць. Новы лад жыцця мог усталявацца толькі пасля поўнага пераразмеркавання маёмасці, а такое, на жаль, было магчыма толькі пры фізічным вынішчэнні ворагаў новай сістэмы. Аўгуст жа імкнуўся пазбавіцца ад супярэчнасцяў паміж асобнымі групоўкамі, якія выклікалі крызіс грамадства.

Другой, на мой погляд, памылкай Цэзара было жаданне і імкненне да громкіх тытулаў, што ніяк не ўжывалася ў Рэспубліцы, нават ў плябейскім асяроддзі. Аўгуст улічыў памылкі і дасягненні Цэзара і таму змог здзейсніць сваю мару. Канешне, імкненне яго да тытулаў не магло быць слабейшым чым у Цэзара, а то і мацнейшым. А чаго можна чакаць ад чалавека, якога лічаць сынам бога, а потым і самым богам? Такі псіхалагічны ціск не мог не адлюстравацца на светаўспрыманні Аўгуста.

Асабліва гэта бачна пад самы канец яго жыцця, калі Аўгуст разважаў, ці не будзе вялікага перапалоху і хваляванняў ад яго смерці.

Паступова збіраючы магістратуры, Аўгуст амаль нічым не рызыкаваў, бо пры адносна павольным руху гэтага працэсу ён мог збавіць тэмпы, калі б была неабходнасць. Але, як мы бачым, яму не толькі не прыходзілася змяньшаць тэмп, але і наадварот, паскараць, бо сенат з народам па сутнасці ўпіхвалі яму ўладу. Канешне, гэта было вельмі моцна звязана з аўтарытэтам Аўгуста. Занадта доўгія войны, занадта многа смерці навокал – і раптам мір! Стабільнасці, спакою, бяспекі – вось чаго жадалі людзі, і Аўгуст даў ім гэта. Што тычыцца сенату, то тым больш ён слабеў, чым больш мацнеў Аўгуст. Вынікам палітычных рэформаў Аўгуста стала сістэма прынцыпату, сістэма, у якой манархія прыкрывалася рэспубліканскай тогай. Гэта быў першы крок да стварэння сапраўднай манархіі. Што да грэкаў, то яны адразу далі адпаведнае прозвішча Аўгусту – Аўтакратар [4]. Можа з-за больш старых традыцый дэмакратыі, ці з-за адсутнасці эйфарыі ў грамадстве, але грэкі разгадалі сутнасць рэформ і на што гэтыя рэформы накіроўваліся.

Аўгуст імкнуўся быць прыкладам як для простага, так і для вышэйшых класаў грамадства ў розных сферах жыцця: у шанаванні бацькоўскіх звычаяў, у рэстаўрацыі старажытных нораваў і рэлігіі. Аўгуст бачыў, у якім маральным крызісе знаходзілася грамадства, і яму нічога не заставалася як аднаўляць пахіснутую рэпутацыю рымскай культуры. Гэтым ён замаруджваў, але не прыпыняў працэс зліцця з Усходам. Рым не мог вярнуцца да старой культуры, таму што ён пераўтварыўся з поліса ў сталіцу Італіі, а потым у сталіцу многанацыянальнай дзяржавы. Далейшае паглыбленне сінтэзу заходняй і ўсходняй культур і рэлігій ужо немагчыма было пераадолець: у Еўропе заўсёды была цікавасць да ўсходніх культаў, гэта бачна нават цяпер.

Ваенныя рэформы Аўгуста змянілі полісную армію абшчыннікаў на прафесійна-наёмную, але гэта не перашкаджала быць міру. Слова «мір» было ва ўсіх на вуснах. Храм Януса пры Аўгусце зачыняўся тройчы, хоць за ўвесь час да яго — толькі два разы. Улада Аўгуста трымалася на трох слупах: аўтарытэт, грошы, армія.

Аўгуст стварыў дзяржаву, якая праіснавала яшчэ паўтысячагоддзя. Наступным пакаленням яго кіраванне запомніцца як перыяд небывалага росквіту краіны. У той час, калі Імперыя будзе падаць пад ударамі варвараў, знойдуцца людзі, якія будуць змагацца не за ўладу, не за багацце, а за мару, якую некалі звалі Рымам.

**Літаратура**

1. История Древнего Рима: Учебник для вузов по спец. История / В. И. Кузищин, И. Л. Маяк, И. А. Гвоздева и др.; Под ред. В. И. Кузищина. М., 2001.
2. Деяния божественного Августа // Шифман И. Ш. Цезарь Август. Л., 1990. С. 189–199.
3. *Шифман И. Ш.* Цезарь Август. Л., 1990.
4. *Гай Светоний Транквилл*. Жизнь двенадцати цезарей / Пер. М. Л. Гаспарова. М., 1993.

# ЖЕНСКИЙ ГОРОДСКОЙ КОСТЮМ В ЭПОХУ АЛЕКСАНДРА I

**Е. И. Романова**

Костюм–это не просто одежда, чьей основной функцией является защита тела человека от воздействий внешней среды; это богатейшее историко-культурное наследие, которое несет в себе разностороннюю информацию о своем владельце и эпохе, к которой он принадлежит. Недаром можно сказать, что история костюма–это история культуры в самом широком смысле. Все то новое, что создавало человечество на протяжении своего существования, нашло свое непосредственное отражение в одежде.

Женский городской костюм в эпоху Александра I возник не в одно мгновение, за ним стоит целая череда взаимосвязанных событий не только российской, но и европейской истории.

Начало XIX в. в России, как и во всей Европе, отмечено господством стиля, который в искусстве получил название неоклассицизма [5, с. 81]. Его главной особенностью стало восхищение красотой человеческого тела, а идеалами были роскошные статуи времен античности. Отсюда и берет свое начало так называемая «нагая мода» [4, с. 102], которая своим появлением была обязана не только античности, но и событиям, которые имели место в XVIII в. Так, первой женщиной, которая в прямом смысле этого слова позволила женскому телу вздохнуть свободно, стала знаменитая королева Франции Мария-Антуанетта. И как ни странно, Великая Французская революция, которая унесла жизни всей ее семьи, все же продолжила начинания королевы в области костюма, еще больше упростив его. Практичные англичане сумели перенять эстафету, и со своей стороны сделали его еще более комфортным и естественным. Париж же со всей своей роскошью, украсив простые и удобные английские платья, сумел создать из них настоящие шедевры, тем самым окончательно утвердив за собой титул мирового центра женской моды.

Своей же популярности «нагая мода» была обязана реформе театрального костюма, в ходе которой художник Давид по просьбе своего друга, трагика Франсуа Тальма, создал сценические костюмы в античном стиле на основе греческих и римских памятников из собраний Лувра, и